**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**“БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ”**

УДК 947.6 “1917”

На правах рукапісу

**РЫЖАНКОЎ**
**Ігар Міхайлавіч**

# СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ВЫРАШЭННІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ І ЭКАНАМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ
**(сакавік – кастрычнік 1917 г.)**

07.00.02 – айчынная гісторыя

Дысертацыя на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Навуковы кіраўнік
доктар гістарычных навук,
дацэнт М. Я. Сяменчык

**Мінск, 2006**

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ............................................................................................... 3

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ........................................................ 8

1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ............................................................ 13

2. УДЗЕЛ СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ ВА ЎСТАЛЯВАННІ І ЎМАЦАВАННІ НОВАГА ЛАДУ........................................................................................ 20

2. 1. Настроі і паводзіны сялянства Беларусі ў працэсе змены ўлады.............. 20
2. 2. Удзел сялянства ў фарміраванні органаў улады і самакіравання............... 24
2. 3. Сялянскія арганізацыі ў вырашэнні грамадскіх і дзяржаўных праблем........................................................ 34
2. 4. Удзел беларускага сялянства ў зборы сродкаў на карысць арміі і падпісцы на Пазыку Свабоды...................................... 46

3. СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ І ВЫРАШЭННЯ ХАРЧОВАЙ ПРАБЛЕМЫ........................... 54

3. 1. Галоўны і губернскія зямельныя камітэты ў падрыхтоўцы аграрнай рэформы (на матэрыялах Беларусі)................... 54
3. 2. Сялянства Беларусі ва ўмовах зямельнай палітыкі Часовага ўрада і падрыхтоўкі да аграрнай рэформы................................. 64
3. 3. Харчовая палітыка Часовага ўрада і асаблівасці яе ажыццяўлення ў беларускай вёсцы.............................................. 80

ЗАКЛЮЧЭННЕ................................................................................... 98

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ............................................................ 103

ДАДАТКІ.......................................................................................... 130

# УВОДЗІНЫ

Гісторыя Расійскай дзяржавы з сакавіка па кастрычнік 1917 г. замацавалася ў грамадскай свядомасці, галоўным чынам, як перыяд барацьбы партыі бальшавікоў за сацыялістычную рэвалюцыю. Таму ў масе навуковай літаратуры доля твораў аб удзеле ўсяго сялянства ў падзеях 1917 года была невялікай, можна меркаваць, па прычыне яго слабай рэвалюцыйнасці. Гэты крытэрый пазбаўляў перспектывы навуковага даследавання іншай, непалітычнай сферы жыцця большай часткі насельніцтва краіны. У нашы дні, калі надзвычай актуалізавалася патрэба ў кансалідацыі грамадскіх сіл, немагчыма абысціся без асэнсавання свайго мінулага. У дадзеным выпадку асвятленне жыццядзейнасці сялянства на зломе дзвюх эпох, яго ўдзел ва ўсталяванні новага ладу, вырашэнні эканамічных і іншых праблем, акрамя навуковых высноў, дае павучальныя, не страціўшыя значнасці і ў нашы дні ўзоры сацыяльных настрояў і паводзін працоўных мас у адносінах да ўсяго грамадства і дзяржавы.

Расійская імперыя ўступіла ў Новы, 1917 год ва ўмовах узрастання сацыяльна-палітычнай напружанасці ў грамадстве, выкліканай працяглай вайной, шматлікімі стратамі на франтах, пагаршэннем жыццёвага ўзроўню і інш. Кіруючая дваранска-памешчыцкая эліта на чале з Мікалаем II лічыла адзіным выйсцем па пераадоленні ўсіх цяжкасцей дасягненне поўнай перамогі над Германіяй і яе саюзнікамі. На дасягненне гэтай мэты былі скіраваны сілы 13, 5 мільённай арміі [534, с. 20], пераведзеная на ваенныя рэйкі прамысловасць, дзяржаўны (адміністрацыйны, контрразведачны, рэпрэсіўны) апарат, ідэалагічныя (царква, асвета, прэса і г. д.) сродкі і інш.

У той самы час, калі слабасць расійскага прамысловага патэнцыялу кампенсавалася замежнымі крэдытамі і ваеннымі пастаўкамі, харчовае забеспячэнне арміі і тылу па-ранейшаму адбывалася выключна на аснове айчыннай сельскай гаспадаркі. Калі да гэтага дадаць, што менавіта сялянства як асноўная маса 160-мільённага насельніцтва краіны найбольш актыўна мабілізоўвалася ў армію і падлягала працоўнай павіннасці на карысць фронта, то можна ўявіць тыя складаныя ўмовы, у якіх існавала вёска, асабліва паблізу ад раёна баявых дзеянняў.

Напачатку 1917 г. у поўнай меры цяжкасці вайны адчувала на сабе звыш 4, 1 млн сялян не акупіраванай немцамі ўсходняй часткі Беларусі ў складзе Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў [211][318][363, л. 219][430]. З улікам Ашмянскага, Вілейскага, Дзісенскага паветаў Віленскай губ. колькасць сялянскага жыхарства складала каля 4, 5 млн. З трох азначаных губерняў Мінская заставалася найбольш развітай эканамічна, тут жа размяшчаліся буйнейшыя памешчыцкія латыфундыі (табл. Д.1.1). Толькі ў Слуцкім пав. Г. А. Радзівілу належалі дзесяткі тыс. дзес. зямлі, маёнткі, гаспадарчыя забудовы, млыны і іншая маёмасць [395, л. 20].

Асноўнымі занядкамі сялянства з'яўлялася: раслінаводства (жыта, авёс, ячмень, пшаніца, грачыха, гарох, лён, каноплі, бульба, морква, капуста, буракі і інш.), мяса-малочная (буйнарагатая) і іншая (коні, свінні, авечкі) жывёлагадоўля, развядзенне хатняй птушкі і інш. Асноўная цяжкасць, якую перажывала

як сялянская, так і памешчыцкая гаспадарка – гэта недахоп рабочых рук па прычыне вайсковых мабілізацый. Так, да пачатку 1917 г. з беларускіх губерняў было мабілізавана каля паловы вясковых работнікаў [534, с. 49][569, с. 20][602, с. 10-11, 42-43]. Па магчымасці, клопат аб палетках "сялянскіх сямействаў, дзе не засталося работнікаў", ускладаўся на вясковыя грамадствы [405, л. 269]. Пэўную дапамогу аказвала выкарыстанне працы ваеннапалонных, бежанцаў [230]. Прыцягненне да сельскагаспадарчых работ "іншародцаў" (кітайцаў, карэйцаў, буратаў і інш.), накіраваных у прыфрантавыя раёны Беларусі, таксама не вырашала праблемы: тэндэнцыя да скарачэння пасеваў захоўвалася [404, л. 49].

Недахоп працоўнай сілы прымушаў землеўладальнікаў і буйных арандатараў здаваць свае палеткі (ворную зямлю, пашу, сенакосы) у арэнду сялянам бліжэйшых вёсак. Беззямельныя сяляне, а таксама бежанцы мелі магчымасць наняцца на працу на выгадных для сябе ўмовах [401, л. 39][591, с. 6]. Гэта акалічнасць абумовіла рост аплаты працы парабкаў і разам з тым змяншала рэнтабельнасць вытворчасці прадукцыі.

Як вядома, мясцовае, у сваёй большасці вясковае насельніцтва выконвала працоўную павіннасць, звязаную з будаўнічымі, рамонтнымі, лесанарыхтоўчымі, ахоўнымі работамі, дастаўкай паліва на чыгунку, ваенныя патрэбы і інш. Іх арганізатары – дзяржаўныя і земскія чыноўнікі – усведамлялі шкоднасць адрыву сялян ад іх гаспадарак, але альтэрнатывы ім не было, таму выкарыстанне сялянскай працы для патрэб фронта працягвалася. У ліку прычын, якія выклікалі непрыязнае стаўленне сялян да азначанай павіннасці, з'яўлялася дрэнная арганізацыя работ, цяжкія бытавыя ўмовы пражывання і інш., але ў асноўным іх матэрыяльныя інтарэсы задавальняліся лепш, чым у панскіх маёнтках. Як зазначалася на земскай нарадзе Мінскай губ., "прыватным землеўладальнікам канкурыраваць з заработнай платай, якая выдаецца на гэтых работах, няма ніякай фактычнай магчымасці" [397, л. 86].

Натуральна, што і гэта акалічнасць негатыўна адбівалася на аб'ёме прадуктаў. Толькі Мінская губ. у тры разы больш іх спажывала, чым выпрацоўвала [638]. У Магілёўскай губ. адчуваўся недахоп уласнага хлеба, паколькі толькі чвэрць зямлі была занята бульбай, збожжавымі і інш. культурамі, а астатняя забяспечвала патрэбы мяса-малочнай вытворчасці [323].

Нягледзячы на жорсткую рэгламентацыю жыццядзейнасці прыфрантавых губерняў, законы рынку не былі ёй падуладнымі, што адбівалася ў няспынным узрастанні дэфіцыту і дарагоўлі спажывецкіх тавараў пры прагрэсіраваўшай інфляцыі. У параўнанні з 1916 годам, рыначныя цэны на мяса, бульбу, яйкі, авёс і інш. прадукты ўзраслі ў 1, 5–2, 5 разы [411, л. 18-20][434].

У такіх умовах харчовае забеспячэнне беларускіх губерняў у многім залежала ад сістэмы цэнтралізаваных паставак хлеба, якая стала даваць збоі. Невыпадкова, мясцовыя ўлады сталі часцей звяртаць увагу на мясцовыя рэсурсы. Асноўныя рычагі па іх выкарыстанні знаходзіліся ў руках вышэйшага ваеннага камандавання. Толькі інтэнданцкім службам штогод належала нарыхтаваць для Паўночнага і Заходняга франтоў, не менш 6 млн пуд. бульбы, 150 тыс. пуд.

буракоў, 100 тыс. пуд. капусты, па 50 тыс. пуд. морквы, рэдзькі і рэпы [421]. Але фактычна, як казаў мінскі губернатар 25 лютага 1917 г., "ніхто з нас не можа ўлічыць, колькі, чаго і калі адчужаецца арміяй у насельніцтва для ўласнага спажывання" [397, л. 8 адв.].

Асноўнымі паўнамоцтвамі па харчовых нарыхтоўках карысталіся службы губернскіх "упаўнаважаных міністэрства земляробства па нарыхтоўцы хлеба для патрэб арміі". У іх жа кампетэнцыі знаходзіліся "ўсе справы па рэквізіцыях жывёлы, збожжавага хлеба і фуража як для патрэб арміі, так і для харчавання мясцовага насельніцтва" [383, л. 21]. Асобна, але ў кантакце з імі, дзейнічалі губернскія харчовыя камісіі [380, л. 7], франтавыя, акруговыя, гарнізонныя інтэнданцтвы. Уласныя каналы набыцця і рэалізацыі прадуктаў мелі арганізацыі Усерасійскага земскага саюза (УЗС), Усерасійскага саюза гарадоў (УСГ) і інш.

Пэўная частка хлеба (жыта, аўса і інш.) нарыхтоўвалася на месцах метадам "развёрсткі" па "цвёрдай" цане, прычым, самі вяскоўцы дастаўлялі яго ў гарадскія "ссыпныя магазіны" па норме, вызначанай земскімі ўправамі на аснове інфармацыі аб магчымасцях сялянскай гаспадаркі (колькасць зямлі, пашы, жывёлы, едакоў і г. д.) [351, л. 27]. Так, у адпаведнасці з пастановай Міністра земляробства за № 66 ад 29 лістапада 1916 г. "Аб развёрстцы збожжавых хлябоў і фуражу", да вясны новага года сялянства Рэчыцкага пав. ссыпала ў магазіны 72 423 пуд., Мазырскага – 29 572 пуд. і 33 ф. (па цане 1 руб. 95 кап. за пуд). Сялянства Мінскага пав. ссыпала 52 310 пуд. жыта, Бабруйскага – 63 544 пуд. 26 ф., Барысаўскага – 37 492 пуд. і 15 ф., Ігуменскага – 75 421 пуд. і 12 ф., Навагрудскага – 8 118 пуд. і 27 ф., Слуцкага – 52 883 пуд. (па цане 2 руб. 13 кап. за пуд) [377, л. 1]. Да 1 сакавіка 1917 г. па заданні ўпаўнаважанага па закупцы хлеба для арміі па Віцебскай губ. Дрысенская павятовая ўправа "развярстала" па 17 валасцях 27 035 пуд. аўса па цане 1 руб. 80 кап. за пуд [370, л. 48].

Між тым, у пачатку 1917 г. сітуацыя з аўсом на Беларусі ўскладнілася настолькі, што галоўны начальнік забеспячэння армій Заходняга фронту генерал Туманаў аддаў загад мінскаму і магілёўскаму губернатарам рэквізаваць запасы (аўса) у буйных землеўладальнікаў [375, л. 34].

Нарыхтоўчыя службы вызначалі для рэквізіцый жывёлы тыя гаспадаркі, дзе мелася лішняе пагалоўе. За час вайны, на Магілёўшчыне было рэквізавана толькі 4-6 % коней і таму на пачатку 1917 г. тут праводзілася адпаведная праца. Так, у Аршанскім пав. належала рэквізаваць 870 коней, а таксама 22 каровы і 2 цяляці [406, л. 35]. У Мінскай губ. з лютага па май 1917 г. належала рэквізаваць 6000 галоў [397, л. 22-23]. Што датычыць буйнарагатай жывёлы, то губернскай земскай управе ўдалося пераканаць урад у мэтазгоднасці яе рэквізіцыі (97 000 галоў) у іншых губернях [397, л. 22-23]. Варта заўважыць, што ваенныя ўлады, нягледзячы на пэўны саслоўны "імунітэт" дваранства, імкнуліся падпарадкаваць усе рэсурсы, у тым ліку памешчыцкія, на патрэбу фронта.

Дзякуючы адладжанай сістэме кіравання, узмоцненай законамі ваеннага часу, вышэйшае камандаванне, упаўнаважаныя Міністэрства земляробства, губернская адміністрацыя, земскія ўправы валодалі неабходнай інфармацыяй аб

харчовым становішчы края, яго працоўных рэсурсах і г. д. [388, л. 12-45][400, л. 2]. Паводле зацверджанага царскім урадам "парадку пастаўкі збожжавых хлябоў і фуража", рэквізіцыі адбываліся шляхам пакупкі прадуктаў (часцей, хлеба, мяса, фуражу) у вытворцаў (сялян, памешчыкаў, арандатараў) па фіксаваных (цвёрдых) цэнах [363, л. 112-112 адв.]. Іншая справа, што самі вытворцы не былі зацікаўлены ў яе продажы па такіх цэнах, якія значна саступалі рыначным. У выніку, як памешчыкі так і сяляне імкнуліся ўхіліцца ад рэквізіцый і ў выпадку неабходнасці прадаць хлеб перакупшчыкам. Але, калі першыя маглі рабіць гэта без рызыкі быць пакаранымі, то апошнія пасля раскрыцця падману падлягалі санкцыям у выглядзе адабрання ўтоеных прадуктаў з кампенсацыяй 85 % іх кошту па цвёрдай цане [372, л. 127]. Але нягледзячы на перашкоды, сяляне актыўна гандлявалі збожжам. Як паведамлялі з Бялыніцкай вол. Магілёўскай губ., у сярэдзіне лютага 1917 г. у вёсках, хутарах, маёнтках назіралася масавая скупка хлеба сялянамі з Мінскай губ., прычым, па двайной цане [331, л. 11].

Характэрнай з'явай на вёсцы пачатку 1917 г. рабілася самагонаварэнне. Як паведамляў 10 лютага лепельскі спраўнік, "у горадзе і павеце, з прычыны блізкасці фронту, назіраюцца выпадкі выганкі, захавання і продажу "самагонкі", якая, аднак, прызначаецца не для мясцовага спажывання, а галоўным чынам для збыту ў тыле арміі і па вельмі высокай цане" [355, л. 83]. У сакавіку ў Віцебскай губ. гэта з'ява набыла масавыя памеры [353, л. 255]. Можна меркаваць, што ва ўмовах уведзенага напрыканцы 1914 г. "сухога закону", і ўзросшага попыту на спіртавыя напоі, самагонаварэнне стала ператварацца ў адну з крыніц даходу для сялян.

У цэлым, беларускія сяляне не выказвалі прыкметных праяў нецярпімасці да існаваўшых парадкаў. Іх "спажывецкі кошык" не саступаў "кошыку" гарадскіх працоўных або бежанцаў. Сялянства адчувала большую патрэбу ў прамысловых таварах, чым у прадуктовых. Выпадкаў галоднай смерці ў беларускай вёсцы не зафіксавана. Дзеці або бацькі, страціўшыя кармільцаў на вайне, мелі сацыяльную падтрымку з боку дзяржавы і апеку сялянскай абшчыны. Валасныя папячыцельствы аказвалі грашовую і харчовую (паёк) дапамогу непаўналетнім (да 17 год) і пажылым (пасля 55 год) членам сям'і мабілізаванага ў войска кармільца [362, л. 312].

У апошнія месяцы самаўладдзя з боку сялян не было зафіксавана ніводнага правапарушэння палітычнага характару, а рэдкія выпадкі аграрнага руху (калі да яго адносіць замахі на панскую або іншую маёмасць) набылі ўстойлівую тэндэнцыю да змяншэння. Але калі першую акалічнасць можна растлумачыць суцэльнай апалітычнасцю сялян, то звязваць спыненне аграрнага руху толькі з эфектыўнасцю ваенна-палітычнага рэжыму было б памылкова. Ва ўмовах вайны кан'юнктура мясцовага рынку складвалася такім чынам, што ўласная гаспадарка і магчымасць заработку ў маёнтках або на казённых аб'ектах гарантавалі сялянам больш рэальныя шанцы падтрымаць свой дабрабыт, чым імкненне зрабіць гэта за кошт панскага дабра.

Аналіз архіўных дакументаў і сучасных дасягненняў гістарычнай навукі дазваляюць заключыць, што з пачатку вайны лад гаспадарчага, сацыяльнага, духоўнага жыцця сялян застаўся амаль нязменным. Гэтаму спрыяла адсутнасць устойлівых транспартных і інфармацыйных камунікацый як з горадам, так і ў межах павета, але вызначальную ролю адыгрывалі псіхаментальныя асаблівасці беларускага селяніна. Да гэтага часу ён асацыіраваў сябе не з пэўным класам, а выключна са сваім грамадствам (обществом), якое з'яўлялася самадастатковай структурай, куды не было доступу "чужакам" (бежанцам, парабкам і г. д.). Замкнёнаму межамі свайго грамадства беларускаму хлеборобу былі ўласцівы традыцыяналізм, кансерватызм, патрыярхальнасць, законапаслухмянасць, апалітычнасць, талерантнасць, міласэрнасць і інш. якасці.

Такім чынам, сяляне Беларусі, як і ўсёй імперыі, неслі асноўны цяжар вайны і не выказвалі вострага незадавальнення сваім становішчам. Пазбаўленыя палітычных правоў, за выключэннем "цэнзавай часткі", вяскоўцы прыкметных шкадаванняў аб тым не выказвалі. Тыя ж з іх, хто быў абраны ў Дзяржаўную думу [159], не з'яўляліся абаронцамі ні нацыянальных, ні рэгіянальных інтарэсаў, а трапілі пад уплыў расійскіх палітычных партый і груповак. У гэтай сувязі ў ліку прычын, што абумовілі звяржэнне самаўладдзя, можна назваць многія, але ніяк не рэвалюцыйную ці якую іншую актыўнасць сялянства. Мала таго, новай кіруючай эліце і дэмакратычнай грамадскасці давялося прыкласці шмат намаганняў для таго, каб прыцягнуць вяскоўцаў да ўдзелу ў рэалізацыі пытанняў (зямельнага, рабочага, нацыянальнага, грамадскага ўладкавання і інш.), не вырашаных папярэдняй рэвалюцыяй і абвостраных у ходзе сусветнай вайны. У ліку найважнейшых праблем, якія паўсталі перад дзяржавай і грамадствам адразу пасля перамогі рэвалюцыі, з'яўлялася ўсталяванне новага з апорай на шырокія народныя масы дэмакратычнага ладу, абарона яго ад магчымых падкопаў з боку праманархісцкі настроенага дваранства, чыноўніцтва і генералітэту, падтрыманне грамадскага парадку і інш., а таксама бесперапыннае прадуктовае забеспячэнне франтоў і гарадского жыхарства. У сілу вядомых прычын магчымасці сялянства ў вырашэнні ўсіх азначаных грамадска-палітычных і эканамічных праблем былі неаднолькава дзейснымі, тым не менш любы яго станоўчы ўклад значна павялічваў шанцы ўсяго расійскага грамадства на дасягненне агульных мэт. З улікам гэтых акалічнасцей у вёсцы, у тым ліку на Беларусі, распачалася разнастайная агітацыйна-прапагандысцкая, культурна-асветніцкая, арганізацыйная праца, ініцыятарамі і выканаўцамі якой з'яўляліся ўсе дзяржаўныя, грамадскія і партыйныя структуры, зацікаўленыя ў рэалізацыі як агульных, так і ўласных (карпаратыўных) інтарэсаў. Урэшце ва ўмовах дэмакратызацыі і распаўсюджання ідэй парламентарызму перспектывы развіцця такой краіны, якой з'яўлялася Расійская імперыя, у многім залежала ад далейшых сацыяльных паводзін большасці яе насельніцтва – сялян. У значнай ступені гэта акалічнасць адчувалася і ў прыфрантавой Беларусі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.*** Задачы пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі настойліва патрабуюць мабілізацыі ўсіх сіл грамадства, у тым ліку выкарыстання вопыту папярэдніх пакаленняў. З набыццём і ўмацаваннем суверэнітэту ўзнікае патрэба ў аб'ектыўнай і ўсебаковай гісторыі беларусаў, і, у першую чаргу сялянства як ствральніка вызначальных матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей нацыі. Відавочна, што адмысловае, заснаванае на сучасных метадалогіі і метадах даследавання грамадска-палітычных, эканамічных, ментальна-псіхалагічных асаблівасцей яго жыццядзейнасці на лёсавызначальных этапах айчыннай і еўрапейскай гісторыі паспрыяе нацыянальна-дзяржаўнаму яднанню ўсяго беларускага народа. Як паказвае аналіз айчыннай гістарыяграфіі, зараз асобныя аспекты беларускай гісторыі ў іх марксісцка-ленінскай трактоўцы не выконваюць сваіх адукацыйных і выхаваўчых функцый. У значнай меры такое становішча ўласціва асвятленню падзей 1917 г. У гэтай сувязі наспела мэтазгоднасць і магчымасць вывучэння мінуўшчыны на аснове новай метадалогіі, заснаванай на прынцыпах гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці.

Зварот да тэмы жыццядзейнасці народа на пераломных этапах гісторыі з'яўляецца нам асабліва своечасовым зараз, у нашы дні, калі ў шэрагу краін адбыліся так званыя "каляровыя" рэвалюцыі. Аналіз тых падзей, акрамя іншага, сведчыць аб тым, што палітычныя дзеячы часам забываюцца на ўрокі 1917 года, не надаючы патрэбнай увагі эканамічным пытанням, сацыяльнай сферы, барацьбе са злачыннасцю, умацаванню дзяржаўных інстытутаў і інш.

Нарэшце, у сувязі з распачатай дзяржаўнай праграмай па адраджэнні вёскі з'яўляецца актуальным і важным распрацоўку фундаментальнай грамадазнаўчай тэмы, у тым ліку па гісторыі беларускага сялянства ў 1917 г.

***Сувязь працы з навуковымі праграмамі, тэмамі.*** Даследаванне адбывалася па ініцыятыве аўтара ў межах тэмы кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ "Грамадскія аб'яднанні і рухі XX стагоддзя на Беларусі". Тэма дысертацыі была зацверджана Саветам БДТУ 28 лютага 2006 г. (пратакол № 6).

***Мэта і задачы даследавання.*** Мэтай даследавання з'яўляецца асвятленне і характарыстыка асноўных форм удзелу сялянства неакупіраванай кайзераўскімі войскамі Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы ў перыяд з сакавіка па кастрычнік 1917 г.

Зыходзячы з вызначанай мэты, у рабоце вырашаюцца наступныя задачы:

- паказваюцца мэты, формы і вынікі абвяшчэння сялянства аб перамене ўлады і іншых падзеях у краіне; яго настроі і паводзіны з гэтай нагоды;
- раскрываецца роля сялянства ў стварэнні і дзейнасці новых органаў улады (валасных камітэтаў, камісарыятаў) і мясцовага самакіравання (земстваў);
- асвятляюцца асаблівасці ўтварэння сялянскіх арганізацый, напрамкі і формы іх дзейнасці, месца ў сістэме іншых грамадска-палітычных структур;
- паказваецца ўдзел сялянства Беларусі ў зборы сродкаў на патрэбы арміі і падпісцы на аблігацыю Пазыкі Свабоды;

■ разглядаюцца асаблівасці развіцця сялянскай гаспадаркі Беларусі г
:здзеяннем зямельных камітэтаў;

■ характарызуецца стаўленне сялянства Беларусі да ўрадавай харчовай
літыкі ва ўмовах хлебнай манаполіі на розных этапах грамадска-палітычнаг
сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

***Аб'ект і прадмет даследавання.*** Аб'ектам даследавання з'яўляецца г
мадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё народаў
сійскай імперыі (рэспублікі) у перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюц
1917 г. Прадметам — удзел сялянства Беларусі ў вырашэнні грамадска-паліт
ных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы пасля звяржэння самадз
жаўя да перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі.

***Храналагічныя рамкі.*** Дысертацыя ўключае перыяд з лютага па кастр
нік (уключна) 1917 г., ад пачатку Лютаўскай рэвалюцыі да ўсталявання Сав
кай улады на Беларусі і Заходнім фронце.

***Метадалогія і метады даследавання.*** Метадалагічнай асновай дасле
вання з'яўляецца сукупнасць прынцыпаў гістарызму, навуковасці і аб'ект
насці, што дазваляе ўсебакова і комплексна вырашаць азначаныя падзеі і пра
сы ў іх развіцці, паслядоўнасці, сувязі і пераемнасці. Для дасягнення мэты
карыстоўваліся канкрэтна-гістарычныя (праблемна-храналагічны, гісторыка-
нетычны, апісальны, параўнальны, сістэмны, тыпалагічны) і агульнанавуко
метады (індукцыі, дэдукцыі, сінтэзу, аналізу і інш.). Для характарыстыкі сял
скай жыццядзейнасці напярэдадні і пасля рэвалюцый спатрэбіўся параўналь
супастаўляльны метад. З прычыны наяўнасці шматлікіх колькасных дадзен
змешчаных у дакументах, аўтарам выкарыстаны метад статыстычнага анал
Метадам контэнт-аналізу даследаваны шматлікія дырэктывы, справаздачы,
нясенні ўладных устаноў, што дало магчымасць аб'ектыўна ахарактарызав
аграрную і харчовую палітыку ўрада і выявіць стаўленне да яе сялянства.

***Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.*** Выкананая пр
з'яўляе сабой першае комплекснае даследаванне ўдзелу сялянства Беларус
вырашэнні праблем грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця Расійс
дзяржавы на этапе падрыхтоўкі да рэформ і склікання Устаноўчага схс
Упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы здзейснена спроба аб'ектыўн
асвятлення ўдзелу сялянства ў працэсе стварэння і дзейнасці органаў ула
Упершыню зроблена спроба аб'ектыўнага асвятлення вызначальных прычь
матываў сялянскага руху, ступені яго палітызацыі. Практычна ўпершын
айчыннай гістарыяграфіі даследавана дзейнасць харчовых і зямельных к
тэтаў, іх уплыў на сялянскі рух; удзел сялянства ў ажыццяўленні ўрадавай х
най манаполіі, дабрачынных мерапрыемствах на карысць арміі, падпісцы на
лігацыі Пазыкі Свабоды.

Матэрыялы даследавання спрыяюць пераадоленню палітызаваных стэ
тыпаў, у тым ліку адносна характарыстыкі сацыяльных паводзін сялянства
ларусі пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі, яго ролі ў вырашэнні палітыч
эканамічных праблем Расійскай дзяржавы. У навуковае абарачэнне ўключ

эялікая, большай часткай не выкарыстаная раней, колькасць архіўных і іншы матэрыялаў па пытаннях, азначаных у плане даследавання, у выніку чаго гісто рыя Беларусі 1917 г. узбагачаецца многімі фактамі і высновамі, якія істотна мя няюць існуючыя ўяўленні аб ёй.

***Практычная значнасць атрыманых вынікаў.*** Вынікі працы могуць пры несці карысць пры падрыхтоўцы краязнаўчых і энцыклапедычных даведніка навучальных дапаможнікаў і падручнікаў для вышэйшай школы па гісторыі Бе ларусі і Расіі. Фактычны і статыстычны матэрыял, звесткі аб сялянстве і інш можа быць выкарыстаны для падрыхтоўкі лекцый, спецкурсаў і семінараў п сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і іншых аспектах рэвалюцы 1917 г. Навуковы зварот да вывучэння сялянства Беларусі адпавядае сацыялі най запатрабаванасці асвятлення праблем эканамічнага, грамадска-палітычнаг і культурнага развіцця беларускага народа ў кантэксце гісторыі Расійска дзяржавы на пераломным этапе яе развіцця, якім з'яўляліся рэвалюцыі 1917 Менавіта на прыкладзе рэвалюцыйных пераўтварэнняў найбольш яскрава мож на прасачыць еднасць інтарэсаў усіх хлебаробаў, незалежна ад нацыянальнасц а таксама яшчэ раз пацвердзіць наяўнасць трывалых гістарычных сувязеў нар даў Расіі і Беларусі. Мяркуем таксама, што ва ўмовах ажыццяўлення дзяр жаўнай праграмы па адраджэнні беларускага сяла праведзенае даследаванн будзе спрыяць узрастанню яе маральнай падтрымкі з боку ўсяго грамадства.

***Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:***

1. Абвяшчэнне сялян аб утварэнні Часовага ўрада і адрачэнні Раманавы адбывалася арганізавана, як правіла, сіламі земскіх служачых і павятовых кам сараў на сельскіх і валасных сходах, а таксама святарамі ў час набажэнства Асноўнай мэтай гэтай працы з'яўлялася ўкараненне ў сялянскую свядомасц пераканання ў тым, што сіламі Дзяржаўнай думы, арміі і народа ў краіне ўст: лявана новая, законная ўлада ў асобе Часовага ўрада, якую неабходна па трымліваць усімі сіламі. Вынікам намаганняў з'явілася прадухіленне разра тання аграрных парушэнняў, захаванне сялянамі правапарадку і звычайна жыццядзейнасці, падтрымка мерапрыемстваў новых органаў улады.

2. З наданнем грамадзянам Расіі палітычных правоў і свабод сялянства п ператварылася ў самы масавы сацыяльны пласт, здольны ва ўмовах дэмакраты зацыі грамадскага жыцця вызначаць склад уладных структур і органаў самак равання. Але па прычыне нізкай адукацыі (ці яе адсутнасці), неразвітасці кл савай свядомасці і інш. актыўнасць сялян у абранні і дзейнасці дзяржаўных о ганаў і земстваў выявілася галоўным чынам на валасным узроўні. У сваёй мас па метаду фарміравання, складу, характару дзейнасці валасныя выканаўчы харчовыя, зямельныя камітэты з'яўляліся дэмакратычнымі ўстановамі.

3. З прычыны неразвітай палітычнай культуры сяляне Беларусі не выказв лі патрэбы ў стварэнні грамадска-палітычных арганізацый. Узнікненне супол Сялянскага саюза, Саветаў сялянскіх дэпутатаў і інш. адбывалася па ініцыяты ве грамадскіх, урадавых і партыйных дзеячаў, галоўным чынам, у мэтах пры пынення аграрнага руху, дэмакратызацыі органаў улады, выканання пастано

Часовага ўрада і яго мясцовых органаў і інш. З узрастаннем палітызацыі грамадства Саветы сялянскіх дэпутатаў ператварыліся ў інструмент барацьбы за ажыццяўленне партыйных задач іх кіраўнікоў. У параўнанні з валаснымі, харчовымі і зямельнымі камітэтамі зацікаўленасць сялян Беларусі дзейнасцю сваіх Саветаў, за выключэннем Магілёўскай губ., была невысокай.

4. Пасля звяржэння царызму мэты, формы і вынікі ўдзелу беларускіх сялян у зборы сродкаў на карысць франтавікоў істотна не змяніліся. Гэтая дзейнасць, у адрозненне ад іншых відаў дабрачыннасці, мела масавы характар і адчувальныя вынікі. Па меры ўзмацнення ў грамадстве антываенных настрояў і крызісных з'яў, яна набывала тэндэнцыю да зніжэння і зусім прыпынілася пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі. Збор сродкаў сялянамі Беларусі ў фонд абароны краіны шляхам падпіскі на аблігацыю Пазыкі Свабоды перавышаў дасягненні іншых сацыяльных пластоў, грамадскіх арганізацый, царквы, устаноў асветы і г. д. У адрозненне ад папярэдніх дзяржаўных ваенных пазык, падпіска беларускага сялянства на Пазыку Свабоды была масавай і выніковай.

5. Заснаваныя Часовым урадам зямельныя камітэты як дзяржаўныя органы для ўрэгулявання спрэчных пытанняў ва ўзаемаадносінах паміж землеўладальнікамі, арандатарамі, земляробамі, рабочымі і г. д., а таксама для падрыхтоўкі аграрнай рэформы, не атрымалі адпаведнай заканадаўчай базы і, па сутнасці, ператварыліся ў інструмент эсэраўскай палітыкі. Аб'ектыўна гэта палітыка адпавядала тагачасным інтарэсам сялянства. Дзякуючы валасным зямельным камітэтам, якія ў сваёй падаўляючай большасці складаліся з сялян, вясковыя грамадствы Беларусі арганізавана, у сваіх мэтах ажыццяўлялі нарыхтоўку лесаматэрыялаў, дроў, выкарыстоўвалі лясныя ўгоддзі для пасьбы жывёлы і г. д., а таксама пуставаўшыя прыватнаўласніцкія і казённыя ўчасткі для азімых пасеваў. Летам-восенню пад уздзеяннем у сваёй большасці валасных зямельных камітэтаў беларускія сяляне ўсе часцей заяўлялі аб сваіх правах на казённыя, царкоўныя, арэндныя і нават хутарскія ўладанні. Да гэтага часу наспела аб'ектыўная неабходнасць заканадаўчай перадачы ўсёй зямельнай (у тым ліку лясной) уласнасці ў распараджэнне зямельных камітэтаў, паколькі ў тых умовах падрыхтоўка да аграрнай рэформы стала набываць прыкметы яе стыхійнага ажыццяўлення сіламі саміх сялян. З прыходам да ўлады бальшавікоў ажыццяўленне аграрнай рэформы адбывалася на аснове аграрнай праграмы Партыі сацыялістаў-рэвалюцыйнераў (ПС-Р) і з апорай на зямельныя камітэты.

6. Пасля звяржэння самадзяржаўя харчовая палітыка Часовага ўрада знайшла ў беларускага сялянства спачуванне і падтрымку. Разам з тым абвешчаная ім закупка збожжа новага ўраджаю ва ўмовах хлебнай манаполіі ў беларускай вёсцы не стымулявала сялянскай актыўнасці з-за істотнага разыходжання цвёрдых і рыначных цэн. Па меры ўзрастання попыту на сельска-гаспадарчую прадукцыю, дзякуючы сялянскаму складу валасных харчовых камітэтаў, на месцах распачаўся перагляд (на карысць земляробаў) кантрактаў на пастаўкі фуражу, умоў арэнды зямлі і аплаты працы. На Беларусі недальнабачная эканамічная палітыка ўрада (павышэнне закупачных цэн, зніжэнне норм

...лажывання, аслабленне цэнтралізаванага забеспячэння і інш.) прывяла да таго, што сяляне пераста元валі лічыцца з дзяржаўнымі і грамадскімі патрэбамі і імкнуліся перш за ўсё абараніць уласныя інтарэсы. У выніку сялянскія пастаўкі хлеба па рэквізіцыях спыніліся пры адначасовым узмацненні яго продажу скупшчыкам і камерцыйнай перапрацоўкі ў спіртавыя напоі. З усталяваннем Савецкай улады харчовае забеспячэнне фронта і гарадоў яшчэ больш пагоршылася.

***Асабісты ўклад суіскальніка.*** Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананай даследчай работай, якая напісана на аснове архіўных крыніц і матэрыялаў перыядычнага друку 1917 г., галоўным чынам, упершыню ўведзеных у навуковае абарачэнне, а таксама гістарычнай літаратуры. Новыя падыходы і метады іх вырашэння, абраныя аўтарам, з вялікай доляй дакладнасці дазволілі рэканструяваць жыццядзейнасць беларускага сялянства ва ўмовах палітычнага і эканамічнага рэфармавання Расійскай дзяржавы.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.*** Палажэнні і высновы дысертацыйнага даследавання абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ. Вынікі працы агучваліся ў выступленнях дысертанта на Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання светапогляду настаўнікаў XXI стагоддзя" (29 лістапада 2002 г., Мінск), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя" (18-19 красавіка 2003 г., Мінск), III Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" (22-23 мая 2003 г., Магілёў), Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі" (28 лістапада 2003 г., Мінск), Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў "НДРС–2003" (9-10 снежня 2003, Мінск), навуковых чытаннях з нагоды 85-годдзя з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі І.М. Ігнаценкі (28 снежня 2004 г., Мінск), 68-й міжнароднай навукова-тэхнічнай канферэнцыі БДТУ (Мінск, 2004), Міжнароднай навуковай канферэнцыі "XXI стагоддзе: актуальныя праблемы гістарычнай навукі" (15-16 красавіка 2004 г., Мінск), IX Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Беларусі "НДРС-2004" (26-27 мая 2004 г., Гродна), Міжнароднай навуковай канферэнцый маладых вучоных "Моладзь у навуцы 2004" (8-12 лістапада 2004 г., Мінск), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Актуальныя праблемы новай і навейшай гісторыі Еўропы і ЗША" (31 сакавіка 2005 г., Мінск), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Першая Расійская рэвалюцыя: прычыны, ход, наступствы" (27 кастрычніка 2005 г., Мінск).

***Апублікаванасць вынікаў.*** Дысертантам апублікавана 14 прац, у тым ліку 5 артыкулаў у навуковых часопісах, 7 артыкулаў і 2 тэзісы дакладаў у матэрыялах канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый складае 56 старонак.

***Структура і аб'ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 3 глаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 137 старонак, з іх дадаткі – 8 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 655 назваў.

# І. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

З першых год станаўлення савецкай гістарычнай навукі ў працах, прысвечаных Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыям, дамінавала рабочая і салдацкая праблематыка, а тэма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, у тым ліку становішча сялянства на доўгія гады набыла другаступенны, фонавы характар. У ліку першых айчынных аўтараў, хто звярнуўся да гісторыі Беларусі часу рэвалюцый 1917 г., быў Я. С. Канчар [237]. У асвятленні гаспадарчага жыцця яго ўвага акцэнтавалася на асаблівасцях землеўладання, спецыялізацыі рэгіёна і інш. Жыццядзейнасць сялянства асвятлялася ім даволі схематычна.

Ф. Ф. Турук у сваёй працы "Белорусское движение" прааналізаваў палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча на Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі, даў характарыстыку сацыяльнага складу сялянства [604]. Пры разглядзе сельскай гаспадаркі аўтар выкарыстаў звесткі 1905 г., але ў цэлым яго праца давала дастаткова выразнае ўяўленне аб становішчы вёскі.

У 1920 г. пабачыла свет брашура В. Кнорына "Революция и контрреволюция в Белоруссии", у якой, акрамя іншага, характарызуецца край напярэдадні Кастрычніка 1917 г., "дзе сялянства забітае больш, дзе б то ні было, дзе сялянская гаспадарка больш за ўсё адставала" [245]. У асноўным увага аўтара была сканцэнтравана на палітычным аспекце жыцця вёскі. У гэтай сувязі варта адзначыць, што ён перабольшваў ролю бальшавікоў у сялянскім руху, заяўляючы нібыта сяляне ўжо у чэрвені пераходзілі на бок бальшавікоў [245, с. 47].

У 1922 г. у навуковым часопісе "Пролетарская революция" з'явілася публікацыя Г. Лялевіча з мэтай асвятлення "гісторыі масавага стыхійнага, эканамічнага руху пралетарыяту і сялянства ў дні КеранШчыны" [269], але, па сутнасці, замест гісторыі, чытачу прапаноўваліся вытрымкі з газеты "Могилевская жизнь" аб сялянскіх парушэннях зямельнага заканадаўства са жніўня па лістапад 1917 г. з даволі невыразнымі каментарыямі. Тым не менш, змешчаны і ў такім выглядзе матэрыял меў пэўную навукова-пазнавальную значнасць.

У 1924 г. выйшаў калектыўны зборнік "Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху", у якім былі змешчаны артыкулы былых партыйных працаўнікоў: В. Кнорына, А. Зіміонкі, А. Бонч-Асмалоўскага, У. Ігнатоўскага, Я. Лёсіка, А. Бурбіса і інш. Але, як і ў папярэдніх працах, сялянскае пытанне было закранута павярхоўна і толькі ў канстэксце дзейнасці бальшавікоў [20]. А. Славінскі пацвердзіў характэрную ў партыйнай літаратуры тэндэнцыю ставіць рэвалюцыйнасць жыхароў і іх адносіны да палітыкі Часовага ўрада ў залежнасць ад маёмаснага стану.

А. Р. Чарвякоў у сваёй працы, прысвечанай 10-годдзю БССР [628], выкарыстаў шмат статыстычных дадзеных, якія грунтоўна характарызавалі аграрны сектар дакастрычніцкага перыяду, але, як і В. Кнорын, ён занадта перабольшваў ролю бальшавікоў у палітычным жыцці беларускай вёскі.

На той час эканамічныя праблемы перыяду Першай сусветнай і грамадзянскай вайны актыўна распрацоўваліся маскоўскімі і ленінградскімі аўтарамі – Н. Д. Кандрацьевым [248], Г. С. Гардзеевым [105], З. Лазінскім [273], якім